*Р.Ф.Харытончык, ст. выкладчык*

# ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў СУЧАСНЫМ БЕЛАРУСКІМ КІНАМАСТАЦТВЕ

Так ужо адбылося, што да сярэдзіны 80-х XX ст. у беларускім кінематографе галоўнай была тэма Вялікай Айчыннай вайны. Беларускімі кінематаграфістамі было створана шмат ігравых і дакументальных стужак, такіх як “Альпійская балада” Б.Сцяпанава, “Вянок санетаў” В.Рубінчыка, “Знак бяды” М.Пташука, “Ідзі і глядзі” Э.Клімава, “Паланэз Агінскага” Л.Голуба і шмат іншых, значная частка якіх трапіла ў аналы айчыннага кіно. Аднак у пачатку 90-х гг. ваенная тэматыка паціху адышла. І толькі апошняя стужка рэжысёра Міхаіла Пташука “У жніўні 44-га” (2000), новае асэнсаванне мінулых падзей надалі тэме Вялікай Айчыннай у сучасным кінамастацтве сапраўды другое дыханне.

Шырока вядомы не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі, перакладзены на многія мовы свету раман У.Багамолава “Момант ісціны”, які быў пакладзены ў аснову сцэнарыя стужкі “У жніўні 44-га”, стаўся той кропкай адліку, якая па сутнасці і адрадзіла гэтую плынь у айчынным кінематографе. “У жніўні 44-га” – гэта не чарговая стужка, прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне, гэта сапраўды новая плынь у айчынным кінамастацтве. Для беларускага кіно і ўласна для М.Пташука карціна “У жніўні 44-га” і сапраўды сталася менавіта тым самым “момантам ісціны”. Лёс гэтай шматпакутнай стужкі быў няпростым. Сёння мала хто ведае, што карціна тры месяцы запар узначальвала рэйтынг расійскіх кінатэатраў, пакінуўшы далёка за сабою шэраг гучных замежных прэм’ер.

Цудоўны акцёрскі тандэм узыходзячых зорак расійскага кінематографа У.Галкіна (Таманцаў) і Я.Міронава (капітан Алёхін), наяўнасць у карціне зорак першай велічыні: А.Пятрэнка (генерал Ягораў), А.Балуеў (Мішчанка), Б.Тышкевіч (пані Гралінская), добрая аператарская праца У.Спарышкова і мастака-пастаноўшчыка А.Чартовіча, майстэрская рэжысура зрабілі з яе сапраўдны айчынны блокбастэр.

Дынамічны сюжэт, закручаная інтрыга, неардынарныя хады – вось тыя складнікі, якія садзейнічалі глядацкаму пры- знанню стужкі. Пабудаваная на добра пазнавальных для гледача вобразах, зробленая ў лепшых традыцыях прыгодніцкага жанру, на даступнай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

сучаснаму гледачу кінамове, закліканая падтрымаць ідэалы чалавечай годнасці, шматпакутная стужка Міхаіла Пташука ўнесла жывы струмень у айчынны кінематограф.

Аднак беларускія кіназнаўцы ўспрынялі гэтую лёсавызначальную падзею даволі стрымана. Больш таго, на стужку абрынуліся шматлікія нараканні. У чым толькі не абвінавачвалі рэжысёра! І ў тым, што недастаткова распрацаваны маральны партрэт герояў, і ў адсутнасці псіхалагічнай глыбіні, маўляў, героі абцяжарваюць сябе пошукамі ворагаў, а не справядлівасці. Ды і ўвогуле “атрымаўся звычайны, адносна прафесійна зроблены баявік пра контрразведчыкаў, якія шукаюць варожых шпіёнаў”, і г.д.

Расійскі глядач успрыняў фільм М.Пташука станоўча, і зусім іншыя высновы гучалі з боку расійскіх кіназнаўцаў.

Адно безумоўна, фільм М.Пташука “У жніўні 44-га” ў хуткім часе спарадзіў плённыя парасткі. Аб гэтым сведчыць нават такі факт, як заява маладога расійскага рэжысёра М.Лебедзева аб тым, што калі б не было “У жніўні 44-га” Міхаіла Пташука, то не было б і ягонай “Зоркі”, аднаго з лепшых расійскіх фільмаў апошняга часу. А тое, што “Зорка” М.Лебедзева не пакінула нікога да сябе абыякавым, па- цвярджае, што на адным з усерасійскіх фестываляў візуальных мастацтваў стужка атрымала прэмію “За разбуджаныя ў гледачоў пачуцці любові, спачування і гонару за Расію і яе народ”.

І ўсё ж такі менавіта М.Пташук сваёй карцінай сарваў тую заслону, якая доўгі час існавала на творах, прысвечаных ваеннай тэматыцы. Ён зрабіў па сутнасці новае сучаснае кіно, больш псіхалагічнае, больш пранікнёнае, сапраўднае кіно высокага кшталту. Аб гэтым само за сябе гаворыць запрашэнне беларускага рэжысёра неўзабаве пасля з’яўлення “У жніўні 44-га” для здымак стужкі “Песня Ружы”.

Стужка “У жніўні 44-га” дала пуцёўку ў мастацкае жыццё не толькі шэрагу маладых, цяпер ужо дастаткова папулярных кінаакцёраў, такіх як А.Панін, Ю.Калакольнікаў, але і згаданым вышэй Я.Міронаву, У.Галкіну і інш.

Фільм Д.Зайцава “Паміж жыццём і смерцю” са стужкаю М.Пташука яднаюць не толькі часавая прастора і героі (у абодвух фільмах дзеючыя асобы – разведчыкі, месца дзеяння – Заходняя Беларусь). Ён практычна зроблены ў гэткім жа стылі, што і “У жніўні 44-га”. Як і М.Пташук, Д.Зайцаў запрасіў для ўдзелу ў фільме вядомую расійскую зорку – акцёра Я.Сідзіхіна. І, як паказаў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

час, ён не памыліўся. І тут, як і ў выпадку з М.Пташуком, галоўную ролю адыграў акцёрскі тандэм Я.Сідзіхін – А.Кацянёў.

У цэнтры стужкі Д.Зайцава – лёс герояў, якія супрацьстаяць гвалтоўнай сістэме. Аднак калі героя А.Кацянёва сістэма па сутнасці зламала і ён паступова ператварыўся ў нейкую драпежную істоту, то духоўную моц Яна (Я.Сідзіхін) пера- адолець не змагла.

Ён не хоча нікога забіваць, больш таго, ён даруе крыўдзіцелям, ён не прагне помсты, ён хоча адзінага – аднавіць справядлівасць. І таму апошняя яго бойка са Стасем-Шэрым (А.Кацянёў), нягледзячы ні на што, ператвараецца ў сапраўдны "момант ісціны" для абодвух герояў.

Назва "Паміж жыццём і смерцю" згадвае не толькі пра стан, у якім знаходзяцца героі, але і сведчыць пра наяўнасць у карціне так званага "містычнага элементу": напрыклад, прадказанне старой цыганкі пра смерць, якая чакае героя наперадзе, з'яўленне Яну маці-нябожчыцы як праява анёльскага свету і г.д.

Аднак калі больш пільна прыгледзецца да самой мадэлі пабудовы карціны, то можна зрабіць выснову, што ў стужках і М.Пташука, і Д.Зайцава спалучаюцца так званыя "зорны" і "містычны" элементы, г.зн. прысутнічаюць асноўныя складнікі крытэрыяў сённяшняга глядацкага поспеху. Гэты містыцызм даволі моцна адчуваецца таксама і ў карціне аднаго з мэтраў айчыннага кіно В.Нікіфарава "На безыменнай вышыні" (маюцца на ўвазе перш за ўсё паядынак двух снайпераў, неверагодная недатыкальнасць героя А.Чадава і інш.).

У аснову стужкі пакладзены рэальныя падзеі – барацьба за стратэгічны ваенны аб'ект, вышыню № 89, якая знаходзіцца на мяжы Беларусі. Менавіта вакол гэтай барацьбы і разгортваецца асноўнае дзеянне фільма. У полк напярэдадні буйнога наступлення прыбывае нечаканае папаўненне – малады кадравы афіцэр А.Малюцін (У.Яглыч) і франтавы разведчык І.Бяссонаў (А.Пашуцін), якія вяртаюцца ў свае часці пасля шпіталю. У час налёту фашысцкай авіяцыі да іх далучаюцца былы крымінальнік М.Малахаў (А.Чадаў), які адстаў ад сваіх, і чэмпіёнка па стральбе сяржант В.Паздеева (В.Таўстаганава). Вайна звяла іх усіх ля безыменнай вышыні. Тут, у беларускіх лясах, Вольга Паздеева пачне смяротную дуэль з фашысцкім снайперам, а Аляксей Малюцін павядзе на смерць роту разведчыкаў, але перш ім давядзецца сустрэць каханне і пазнаць здрадніцтва.

Пошукі новых шляхоў увасаблення тэмы Вялікай Айчыннай

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

прывялі да спалучэння ў кінатворах апошніх часоў разнастайных жанраў і кінематаграфічных плыняў. Характэрнай рысай з'яўляецца духоўнае ўспрыманне мінулых падзей. Усё больш увагі надаецца нюансам узаемаадносін паміж галоўнымі персанажамі. Рэжысёраў цікавяць не столькі падзеі вайны, колькі паводзіны герояў у экстрэмальных абставінах. Разам з тым для ўсіх азначаных стужак уласцівы не толькі сцэнічная напружанасць дзеяння і вастрыня драматычных сітуацый. Значная ўвага адводзіцца маральна-этычным праблемам узаемаадносін асобы і грамадства, складанасцям чалавечых пачуццяў. Псіхалагічны партрэт заваёўніка ўсё больш набывае містычныя рысы, што абумоўлена апошнімі навуковымі даследаваннямі, якія даказалі сусвету тыпова акультныя карані трэцяга рэйха.

Сярод  стужак апошняга часу, прысвечаных тэме Вялікай Айчыннай, вылучаецца "Глыбокая плынь" М.Касымавай і І.Паўлава – паэтычная лясная балада, якая распавядае аб складаных падзеях першых месяцаў Вялікай Айчыннай на тэрыторыі акупіраванай Беларусі. Галоўныя героі фільма – малады партызанскі камандзір Іван Антанюк (Яраслаў Іваноў), сувязная Вольга (Зінаіда Кірыенка), камандзір роты дэсантнікаў Каткоў, былы інжынер Будыка (Аляксандр Ждановіч), камсамольцы Надзея, Павел, Дзяніс і іншыя – паказаны ў складаным перапляценні падзей, іх характары раскрываюцца ў напружаных драматычных сітуацыях. Лёсы герояў перакрыжоўваюцца, а экстрэмальныя абставіны абвастраюць скрытыя рысы характару. У пабудове ваенных эпізодаў вельмі моцна адчуваецца ўздзеянне Міхаіла Пташука. Гэтаксама, як і ў карціне "У жніўні 44-га", рашаючая бойка цягнецца ўсяго некалькі хвілін экраннага часу, а сама стужка прымушае да сур'ёзнага роздуму над светапогляднымі пытаннямі. Сярод акцёрскіх работ можна адзначыць эпізадычную ролю расійскай зоркі Кацярыны Васільевай, якая сыграла немку-лекара Ганну Бумель, Аляксандра Ткачонка (дырэктар дзіцячага дома) і Яраслава Іванова. У параўнанні з першаасновай кінатвор вызначаецца большай дынамікай і напружанасцю дзеяння, адсутнасцю набіўшага аскоміну пафасу. Вайна для герояў "Глыбокай плыні" з'яўляецца тым самым выпрабаваннем, тым самым "момантам ісціны", што і для разведчыкаў "У жніўні 44-га".

Адмовіўшыся ад пафасу першакрыніцы, стваральнікі фільма здолелі паказаць, што для беларускага народа гэта была не проста вайна, а вайна свяшчэнная – вайна за духоўныя ідэалы, вайна за

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

росквіт роднага краю.

У падборы акцёраў відавочна прасочваецца тыпізацыя персанажаў. Яны ўсе такія светлыя, адухоўленыя. Па ўсім відаць, што гэтыя людзі не любяць ваяваць і за зброю яны ўзяліся толькі дзеля таго, каб абараніць сваю зямлю. Яны да канца выконваюць галоўную хрысціянскую запаведзь – пакласці сваё жыццё за сваіх блізкіх. Невыпадкова ў стужцы некалькі разоў узнікае вобраз храма, сімвалізуючы тую непераможную моц і веліч духу, якія на працягу ўсяго дзеяння дэманструюць героі.

З'яўленне ў наш час неакрэсленасці маральна-эстэтычнай арыентацыі падрастаючага пакалення такой карціны, як "Глыбокая плынь", падаецца даволі своечасовым. Сёння надзвычай важна вярнуць з дапамогай экрана паняцце чалавечай годнасці, адлюстраваць у фільмах стан душы, рэанімаваць паняцце патрыятызму. Нездарма ў карціне "Глыбокая плынь" герой Я.Іванова агучвае, што на самай справе слова "партызан" азначае – сын Радзімы. Добрая аператарская работа, вастрыня сюжэта і дынамічнасць дзеяння, хараство беларускіх краявідаў, то трапяткая і пранікнёная, то да болю пранізлівая музыка надаюць карціне шчырасць і сапраўдную ўзнёсласць.

І нягледзячы на тое, што фільмы пра вайну патрабуюць найвялікшага эмацыянальнага напружання, яны ўзвышаюць і ачышчаюць душу.

У наш час, калі кінамастацтва з'яўляецца важнейшым сродкам фарміравання светапогляду асобы, сцвярджэнне праз кінамову духоўных ідэалаў і нацыянальных каштоўнасцей дапамагае выхаванню ў моладзі маральных якасцей і садзейнічае фарміраванню масавай свядомасці. Таму пачэсная задача – адраджаць нацыянальную культуру, уздымаць дух народа, уздзейнічаць на маральную самасвядомасць і пачуцці асобы – ускладзена сёння менавіта на айчыннае кінамастацтва.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ